По его словам, *"по заказу медвытрезвителя предприятие "Белмедтехника" изготовило экспериментальное кресло для буйных пациентов, испытание этого приспособления начнется в ближайшее время"*. Собеседник агентства также проинформировал, что *"после экспериментального использования кресла сотрудники вытрезвителя сделают свое заключение об эффективности смирительного кресла и передадут свои предложения по его усовершенствованию разработчикам"*. Планируется, что *"в минском медвытрезвителе появится еще три кресла для буйных пациентов"*, — сказал С.Бабицын.

"Очень часто пациенты вытрезвителя пытаются выяснять отношения между собой при помощи силы. Особо буйных будут сажать в кресло, привязывать ремнями и давать им возможность отдыхать", — рассказал начальник медвытрезвителя.

Собеседник агентства рассказал, что *"вытрезвитель хотел приобрести смирительные рубашки для особо активных любителей спиртного, но по медицинским нормам такие рубашки можно использовать только в психиатрических больницах и психиатрических диспансерах"*.

Владимир Ермошин «всплыл» в Минске

Александр Лукашенко назначил ответственными за строительство многофункционального спортивного комплекса "Минск-Арена" **Владимира Ермошина**, занимавшего в свое время пост премьер-министра страны, а позже работавшего в Москве, и **Николая Ананьева**, являвшегося ранее помощником президента по вопросам физической культуры, спорта и развития туризма.

"Владимир Ермошин будет курировать общие вопросы строительства этого объекта, Николай Ананьев — выполнять обязанности его заместителя. По поручению президента они будут осуществлять контроль за качеством, сроками и объемами строительных работ", — сообщили "Интерфаксу" в пресс-службе президента.

Ранее А.Лукашенко поставил задачу ввести комплекс в эксплуатацию в 2009 году. На базе комплекса "Минск-Арена" планируется создать необходимые условия для учебно-тренировочного процесса и проведения соревнований по 28 видам спорта.

В комплексе будут созданы ледовая дорожка для занятий конькобежным спортом, специализированная база для занятия фигурным катанием, а также велодром.

В числе основных объектов — многофункциональная спортивно-зрелищная арена вместимостью 15 тысяч зрителей, конькобежный стадион на 3 тысячи зрителей и велодром с трибунами для 2 тысяч зрителей. На территории, примыкающей к улице Нарочанской, предусмотрены места для установки торговых павильонов. В коммунальной зоне комплекса разместится закрытая автостоянка на 520 автомобилей, на крыше которой будет устроена открытая стоянка.

ЗАКУЛИСЬЕ

Кто он, Роберт Часнойть?

Полгода медики страны гадали, кто же займет место первого заместителя министра здравоохранения. Интрига подогревалась тем, что эту должность прочили лечащему врачу Лукашенко (говорят, уже бывшему), а ныне главврачу Республиканской больницы Управления делами президента **Ирине Абельской**. Однако Лукашенко не спешил с решением. И то, что он недавно утвердил на эту должность известного только в медицинских кругах **Роберта Часнойтя**, стало своего рода сенсацией.

Собственно то, что вот-вот кресло первого заместителя министра должен покинуть **Виктор Колбанов**, стало известно еще 25 мая. Именно в тот день на XX съезде Белорусского общества Красного Креста Колбанов был избран генеральным секретарем этой общественной организации. А поскольку должность генсекретаря штатная, то Колбанов должен был уволиться из министерства и поступить на работу в Белорусский Красный Крест. Юридически он не мог совмещать два ответственных поста. Полгода генсекретарем БКК Колбанов числился де-факто, а де-юро занимал пост заместителя министра здравоохранения. Судя по всему, уже на этой неделе в трудовой книжке Виктора Васильевича появится новая запись. 27 октября А.Лукашенко дал согласие на назначение на должность первого замминистра **Роберта Часнойтя**. К слову, 5 лет назад, практически в это же время — 19 октября — первым заместителем министра — тогда **Владислава Астапенко**, стала **Людмила Постоялко**, мать Ирины Абельской. О том, как успешно сложилась в столице карьера доктора из Бреста, известно всем.

Роберт Часнойть — представитель Гродненщины. Стоит отметить, что в руководстве Минздрава выходцев из этого региона пока не было. Были представители из Минска, Бреста, Гомеля... Часнойть — кардиолог по специализации, но уже давно работает в структуре управления системы здравоохранения. С 1991 года Роберт Часнойть занимал должность сперва заместителя, а потом и руководителя Управления охраны здоровья Гродненского облисполкома. С 2000-го по 2004 год был депутатом Палаты представителей. Но, как вспоминают некоторые бывшие парламентарии, ничем себя в Овальном зале не проявил. Часнойть не входил в состав оппозиционной группы "Республика", не голодал вместе с коллегами, протестующими против поправок в Избирательный кодекс. Зато периодически в прессе Роберт Александрович рассказывал о выполнении на Гродненщине поставленных правительством социальных показателей.

Стоит отметить, что Роберт Часнойть имеет не только диплом доктора, но и звание кандидата экономических наук. Говорят, он едва ли не единственный в белорусской медицине специалист, который легко ориентируется в экономической сфере всей системы здравоохранения. Возможно, профессиональные качества и позволили Часнойтю занять ответственный пост.

В понедельник, 30 октября, новый замминистра еще находился в Гродно, на прежнем месте работы. Весь день мы пытались связаться с ним по телефону. Но Роберт Александрович на вопросы не ответил, сославшись на занятость (через своего секретаря). Справедливости ради надо отметить, что весь день, судя по ответам того же секретаря, он напряженно работал: провел рабочее совещание с коллективом Управления охраны здоровья, принял посетителей, а в конце рабочего дня встретился с главой Гродненской области Владимиром Савченко. Только во вторник новый руководящий работник Минздрава отбыл в Минск. К слову, рокировка Часнойть—Колбанов не единственная в Минздраве. В один и тот же день Лукашенко назначил на должность заместителя министра **Валерия Шевчука**. Он сменил на этом посту **Александра Романенкова**...

Возможно, уже скоро Роберт Часнойть познакомится со столичными журналистами, и тогда мы сможем задать ему несколько вопросов. Во всяком случае его предшественник Виктор Колбанов регулярно давал пресс-конференции для журналистов. Хотя... Новый министр здравоохранения **Василий Жарко** за полгода ни разу не удосужился рассказать пишущей братии о делах своего ведомства. Неужели руководителю службы, косвенно касающейся каждого из нас, нечего рассказать народу?

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ПАМЯЦЬ

Год без Васіля Гроднікава

Так, ужо год, як яго няма з намі, такога рознага ў праявах свайго характару і настрою: то жыццярадаснага і адкрытага, то ўдумнага і засяроджанага ў сабе. Але заўсёды — шчырага, мудрага, надзейнага, які не адступіца ад таго, у чым перакананы, у што верыў і што хацеў паведаць людзям.

Ужо год, як чытачы "Народнай волі" не сустракаюць на старонках сваёй газеты публікацый за знаёмым подпісам — Васіль Гроднікаў. Яны ўзрушвалі жывой праўдай жыцця, глыбінёй яго асэнсавання, вастрынёй і вобразнасцю выказвання. Аўтар глыбока пранікаў у чалавечую душу, у сутнасць складаных праблем...

Асабліва добра, як мала хто, ведаў Васіль Пятровіч беларускую вёску. Сам сялянскі сын, ён разам са старэйшым братам — будучым пісьменнікам Міколам Гродневым — змалку зведаў і цану кавалку здабытага цяжкай працай хлеба, і горыч сіроцтва, і спатолю людской дабрыні. Як мала хто іншы разумеў ён клопаты, беды і радасці вяскоўцаў, любіў іх, нават калі мусіў гаварыць у вочы балючую, суровую праўду. Ён быў па-сялянску дбайным аратым на сваім полі, уздымаючы, пласт за пластам, глыбы сучаснай рэальнасці.

Артыкул "Галасы крыжоў", які мы нагадваем сёння чытачам, Васіль Гроднікаў пісаў, калі яшчэ не было такога шуму вакол "адраджэння вёскі" ці аграгарадкоў, якія толькі падкрэсліваюць непрыгляднасць агульнай карціны сельскага быцця. Чытаеш — быццам сёння напісана...

Васіль Гроднікаў рыхтаваў кнігу пад назвай "Аброць на Беларусь", але яму не суджана было ўбачыць яе выданне.

Раптоўная смерць пры дагэтуль загадкавых абставінах спыніла пяро выдатнага журналіста-мастака. Але створанае таленавітым, мужным майстрам пяра застанецца надоўга. І нам, народавольцам, не верыцца, што яго няма. Пра такога неардынарнага чалавека, такую яркую асобу вельмі цяжка казаць у мінулым часе...

Рэдакцыя газеты "Народная воля".



Васіль ГРОДНІКАЎ

Галасы крыжоў

Ці зіма на двары, ці гарачае лета, ці мокрая восень, у вёсцы ціха, як у дамавіне. Хіба што пеўні сяды-тады распяюцца, суседскія сабакі набрэшуць на паштальёнку ды каторы п'яны мужык пабегае з сякерай ці нажом за жонкай (бывае і наадварот).

Людзей мала. І тыя больш па хатах ды ў паветках. Кожны пры сваіх справах: хто па гаспадарцы шчыруе, хто шукае, дзе б выпіць, хто ўжо спіць, прыняўшы на грудзі "снатворнага", а каму нездаровіцца, і ён употай просіць Бога хутчэй забраць да сябе.

Вёска сёння — гэта рэзервацыя, дзе асела трэцяя частка насельніцтва краіны. Раздзелены яны па "бараках" — у 2600 калгасах і саўгасах. Роля і аўтарытэт сельсаветаў намінальныя: даць даведку, прыпісаць на сталае або часовае жыхарства (па-прыгоннаму — замацаваць за памешчыкам), сабраць падаткі на зарплату сельсавецкім "пісарам" ды яшчэ сёе-тое па дробязях. Калгасы і саўгасы цяпер фактычна дзяржаўныя структуры на вёсцы, аснова і апора рэжыму ў татальным кантролі за ціхім і памяркоўным мужыком, надзейным электаратам улады.

Водгуллем успамінаецца дзяцінства, калі на вёсцы ў кожнай хаце на кожнае акно было душы па дзве падшыванцаў. А сёння, бывае, на ўсе аканіцы адзін маршчыністы твар, агорнуты стракатай хусцінкай. Глядзіць старая кабета гадзінамі на вуліцу, пэўне, стараецца запомніць сумны вобраз сённяшняй вёскі ды забраць тую памяць у лепшы свет, каб здзівіць тамтэйшых нябожчыкаў: на іх радзіме ўсё горш і горш...

Вёска з сённяшнімі яе насельнікамі (яны ўсё часцей пазіраюць на пагорак з царквою — там могілкі ў жоўценькім пясочку) нікога не асуджае, ні на што і ні на каго не жаліцца, ні на каго не крыўдуе і ні на каго не спадзяецца. Яна да такога доўга прывыкала і, нарэшце, прывыкла. Пэўне, адбылася нейкая мутацыя генаў. Быццам нехта падмяніў людзей: касінераў — на палахліўцаў, жылістых і працавітых — на хілых і лайдакаватых, дбайных — на прапойцаў, мужных паўстанцаў за зямлю і волю — на здраднікаў і наймітаў акупацыйных рэжымаў.

Часам не верыш гісторыкам, што некалі на гэтай зямлю жылі гордыя ды заможныя, нязломныя і адчайныя людзі, што не ведалі страху, не гнуліся і дзяцей сваіх выхоўвалі на лепшых прыкладах слынных продкаў. Называліся тыя людзі ліцвінамі, а не калгаснікамі.

А цяпер, каго ні спытаеш са старых, то пачуеш: а што яшчэ нам трэба — хлеб аўталаўка прывозіць, пенсію даюць рэгулярна. Пры гэтым успамінаюць вайну і пасляваенную галечу, і ўсе тое параўноўваюць з сённяшнім днём. "Дзякуй Богу, — кажуць, — што няма вайны. Колькі нам засталося? Мы тут ужо ў гасцях". І дзівішся часам, што ніхто пры гэтым чамусьці не думае пра дзяцей, унукаў і праўнукаў. Не шкадуюць, што ім нічога не застанецца, акрамя старых хат і пакошаных хлявоў. Можа, у каго і было колісь на ашчадных кніжках колькі тысяч, а цяпер тых кампенсаваных грошай хопіць на два кукішы пад нос начальству. "На нашы грошы начальства сабе харомаў набудавала...". Але ні папроку ў голасе, ні адчаю. Абгаворваюць спакойна, быццам забралі не іхняе, а чужое, як некалі без спачування назіралі за бальшавікамі, якія падчышчалі ўсё з двароў іх больш заможных суседзяў. Можа, гэта адплата за тое, што моўчкі патуралі злу, а то і радаваліся часам бядзе іншых?

Мала хто задумваецца: чаму кепска пражыў сваю жытку? Яны ўсё сваё жыццё паклалі на "росквіт" калгаса ці саўгаса, працуючы іншым часам за адны "палачкі", за ламаны пятак ці за паўкіло жыта і посцілку ячнай саломы.

Сёння калгасы, бывае, не ў стане дапамагчы нават пахаваць сваіх былых калгаснікаў. Бывае, што і дошак на дамавіну няма. Радня па гарбылю ў суседзяў збірае. Ды яшчэ паспрабуй угаварыць каторага, каб дол выкапаў.

Ніхто многім, хто ўжо нікуды не спяшаецца і ні пра што не перажывае, не сказаў пры жыцці добрага слова, не зрабіў добрай справы. Гэта яны толькі рабілі, рабілі... Тут так прынята. Тады і цяпер. Маўляў, не адзін ты такі.

І, у рэшце рэшт, не застанецца па небараку ніякай памяці. Акрамя таго, што жыў, працаваў, памёр... Гэта, пэўне, ад таго, што і ў нябожчыка пры жыцці былі такія адносіны да бацькоў, дзядоў, прадзедаў. Ён не ведаў свой род, не шанаваў сваё радавое дрэва, не клапаціўся пра іх вечны спакой. Калі і хадзіў на могілкі, то міма царквы, каб лішні раз выпіць ды чаго добрага пасля другой-трэцяй шклянкі заспяваць песню, а то і ўчыніць на могілках бойку.

Якое жыццё, такая і памяць...

З тых, хто застаецца яшчэ жыць, у шмат каго памяць ужо адпітая.

Не помняць, як грашылі...

Не помняць, ці гаварылі каму добрыя словы...

Не помняць, ці маліліся калі...

Не помняць, ці любілі каго...

Не помняць, які сёння дзень...

Замест "Даруй, Госпадзі!" — мат-перамат...

Замест дабрыні — зайздрасць, злосць, спакуса...

Замест малітвы — пляшка самагонкі без закусі...

Сын б'е маці, бацьку. Унук адбірае пенсію ў бабулі, выносіць з хаты ўсё, што можна. Каб выпіць, пахмяліцца.

Бутэлька засціць слых, зрок, розум, сумленне. Нарэшце, Бога...

Хто ж пра яго будзе помніць, калі ён і напаследак, збіраючыся на той свет, не здольны сказаць добрае развітальнае слова, не папросіць даравання ні ў людзей, ні ў Бога. Не ведае ён такіх слоў, хоць і пражыў на гэтым свеце нямала...

Ды, нарэшце, і не патрэбны нікому гэтыя словы. Іх не зразумее той, хто ніколі ў жыцці не гаварыў тых слоў ні сам, ні ад кога не чуў. Можа, і чуў, але памяць сцерлася, знікла...

Людзі без памяці. Людзі без дабра. Людзі, што дарэмна пражылі свой век на зямлі. Людзі без Бога ў галаве і душы...

Людзі, якія не выканалі на гэтым свеце сваю місію, наканаваную ім Богам. Душа выпырхнула з цела, як з клеткі. Скалечаная, гулка-пустая, пакрыўджаная...

Шкада, што тыя з нас, хто не задумваецца пра сэнс свайго існавання на зямлі і не імкнецца адпавядаць свайму прызначэнню на гэтым свеце, даюць шмат дадатковай працы Усявышняму па ачышчэнні Сусвету ад грахоў і прымушаюць яго высільвацца, каб даць нам больш ахвоты стаць хоць крыху лепшымі.

Пашкоджана асяроддзе, парушана гармонія быцця, першасная аснова Сусвету ў дачыненні да Зямлі і асобных яе рэгіёнаў, парушана суладдзе ўзаемнай адказнасці пакаленняў перад сваімі продкамі, гісторыяй. Станем больш духоўнымі — тады нам адкрыецца шлях да ісціны. А дазволім і надалей правіць на зямлі "праваслаўным атэістам" і чыноўнікам-"падсвечнікам" ды будзем па-ранейшаму бяздумна і паслухмяна ісці за імі пад посвіст "вертыкальнага" бізуна, — дарога нам да лепшай долі закрыта.

Так і будзем блукаць, дарэмна старацца перайначыць на свой лад агульнапрызнаную мадэль хрысціянскага суіснавання ды згараць ад злосці і зайздрасці. Звядзём сваю жытку да пагорка з жоўценькім пясочкам за вёскай ці горадам, так і не патрапіўшы за тую мяжу, за якой маглі б стацца людзьмі. А не быдлам...

Будуць мяняцца рэжымы, будуць сыцець і патанаць у раскошы правіцелі, таўсцець на аб'едках з царскага стала прыдворная знаць, а нам ідэалагічныя кухары будуць плюхаць у міску прапагандысцкую пахлёбку і наліваць шклянку агітацыйнага хмелю. Тады мы і надалей будзем паслухмяным быдлам. Тут, дзе некалі буяў святы агонь свабоды, гонару і годнасці ліцвінаў, будзе ціха, млява, як у зачараваным сне. Затое надзейна для ўладаў, дыктатараў розных колераў. Баючыся граху, нікога не асуджаю, а толькі занатоўваю свае думкі, што неадступна ідуць за мной апошнія гады ў вясковай глухамані, спадзеючыся, што, можа, хто-небудзь з вяскоўцаў яшчэ паспее адумацца і спахопіцца, аглянецца. А калі азірнецца і заўважыць, колькі награшыў на гэтай зямлі, можа, сціснецца ягонае сэрца ад сораму ці спачування да самога сябе. Тады яшчэ не ўсё згублена...

Шкада, што сапраўдныя ісціны мы пачынаем спасцігаць толькі на парозе ў лепшы свет. Але суцяшае, што хоць і не можам мы генетычна перадаць нашчадкам сваё азарэнне, затое, на маю думку, напаследак асвятляем свой след на зямлі духоўна-містычнай, псіхалагічнай аўрай, настоенай на нашым вопыце жыцця і глыбіні нашай духоўнасці. Хто пажадае, хто адчуе патрэбу ў ісціне, таму знойдзецца. Будзем спадзявацца...

А тыя з маладых, хто па розных прычынах застаўся ў вёсцы, — гэта ў пераважнай большасці юнакі з аслабленай сілай волі, якія не здолелі супрацьстаяць п'янству, гультайству, зладзейству, — гэта тая катэгорыя, якая папоўніла і без таго шматлікія шэрагі прыгонных калгаснікаў, злілася з агульнай сялянскай масай і з'яўляецца неад'емнай часткай выміраючай вёскі.

Вёска вымірае. Трагічна, марудна, ціха, гэткім чынам галасуючы за "рэформы" свайго прэзідэнта. Галасуюць жоўтымі грудкамі на пагорку, галасуюць свежаструганымі праваслаўнымі і каталіцкімі крыжамі, галасуюць памінальнымі малітвамі, ладанам і свечкамі ў царкве і касцёле. Гэты "рэферэндум" уладамі падаецца як натуральная з'ява, як, дарэчы, і змяншэнне нараджальнасці і скарачэнне працягласці жыцця насельніцтва Беларусі.

Вяскоўцы старэюць, робяцца нямоглымі і адзінокімі. Гэта можна заўважыць без аніякага сацыялагічнага даследавання. Дастаткова паглядзець на статак свойскіх кароў, што ідуць на пашу або вяртаюцца з выпасу. У год майго прыезду ў Мазалі на сталае жыхарства ў сярэднім на кожны двор было па 2—3 каровы. Сёння на 2—3 двары — адна кароўка. Парадзела і птушынае царства: 3—5 курак на падворку. Камбікорм дарагі, гадаваць на казённым хлебе — сабе даражэй. Затое мясцовая "гара" ў паўтара-два разы таннейшая за "казёнку". Ёсць чым заліць "пажар душы" з-за няспраўджаных надзей...

"Сціранне граняў" паміж горадам і вёскай, пра якое так марылі бальшавікі, тут, у вёсцы, здзейснілася. Сцерлася ўшчэнт першым чынам спрадвечная культура вясковага ўкладу. Рэшткі яе калечацца сёння сталым пакаленнем і прыезджымі на канікулы дзецюкамі пад уздзеяннем самагоннага перагару.

Колішняя вясковая гармонія жыцця пры "дапамозе" бязглуздавых, бяззямельных камунараў, прысланых з горада камісараў дала спачатку трэшчыну, а потым і зусім рассыпалася ад усеагульнай калектывізацыі спачатку на ўсходзе краіны, затым — на захадзе.

Высахлі крыніцы дабрыні і справядлівасці, набожнасці і сарамлівасці, святой адказнасці за спрадвечны ўклад папсапраўднаму чалавечых адносін. У сэрцах пасяліўся страх не перад Богам, а перад начальствам. Ён, гэты страх, кляшчамі ўпіваецца ў душы сялян. Страх стаў галоўным пачуццём — як найгалоўнейшае дасягненне і здабытак сацыялізму ў вёсцы і горадзе.

Гэта вам пацвердзіць сумнае аблічча сённяшняй вёскі, могілкі з яшчэ новымі крыжамі, якія не паспелі спілаваць на дровы вясковыя "камунары", не пабурылі рагулі і не раскапалі тутэйшыя свінні...

Маўчаць крыжы. Дакорлівы іх позірк. А можа, яны нешта перадаюць нам з царства Аіда, ды толькі мы пакуль не можам адчуць, зразумець сігналы-папярэджанні нам, яшчэ жывым?

Не, мы не чуем галасы крыжоў. Пэўне, таму, што парушана суладдзе чалавека з Космасам і Зямлёй, разарвана сувязь пакаленняў, зруйнавана сапраўдная гісторыя краю. Нашы вушы ўспрымаюць праўду як зло, хлусню — як вышэйшую дабрачыннасць...

Наступныя пакаленні будуць збіраць тыя камяні, якія кінулі мы ў наша мінулае. Яны будуць жаць ніву, якую мы засеялі атрутным насеннем.

Мы не ведалі, што тварылі.

Даруй нам, Госпадзі!..

2001

КАНФЛІКТ

Вернікі просяць дапамогі ў Бога і ў Аляксандра Лукашэнкі

Вернікі Гродзенскай дыяцэзіі Беларускай рымска-каталіцкай царквы звярнуліся з пасланнем да прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. У ім утрымліваецца просьба вырашыць пытанне аб падаўжэнні дазволу на працу на будучы год сямі польскім святарам і пяці польскім манахіням.

Як паведамілі БелаПАН у Гродзенскай дыяцэзіі, такое рашэнне было прынята пасля таго, як у жніўні Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце міністраў адмовіўся падоўжыць дазвол на працу польскім грамадзянам, матывуючы сваю пазіцыю неабходнасцю працаўладкавання ксяндзоў — грамадзян Беларусі, якія выпускаюцца ў Гродзенскай і Пінскай вышэйшых духоўных семінарыях па падрыхтоўцы святароў для рымска-каталіцкай царквы. Такі адказ на зварот у абарону святароў і манахінь, пад якім падпісаліся некалькі тысяч чалавек, быў атрыманы таксама 26 верасня ад гродзенскіх уладаў.

Нагадаем, епіскап Гродзенскі, старшыня Канферэнцыі каталіцкіх епіскапаў у Беларусі Аляксандр Кашкевіч звярнуўся да вернікаў з просьбай аб тым, каб яны маліліся за ўсіх святароў і манахінь, якія працуюць у дыяцэзіі. Заклік епіскапа ў мінулыя выхадныя быў зачытаны ва ўсіх касцёлах вобласці, пасля чаго вернікі пачалі збіраць подпісы за тое, каб польскія святары і манахіні маглі працягваць працаваць у Беларусі.

Марат ГАРАВЫ.

ВЫШУК

Вышукваюць забойцу чатырохгадовай дзяўчынкі

Труп чатырохгадовай Ляны быў знойдзены раніцай 24 кастрычніка ў раёне вадаёма на вуліцы Сядых. Напярэдадні мама пакінула дзяўчынку на некалькі хвілін каля пад'езда, а сама вярнулася дамоў за курткай. Потым, не знайшоўшы дзіця самастойна, яна звярнулася ў міліцыю. Пошукі працягваліся ўсю ноч, і толькі раніцай дзяўчынку знайшлі за квартал ад дома. Паводле папярэдняй інфармацыі, спосаб забойства — удушэнне.

Ужо ўстаноўлены людзі, якія нібыта 23 кастрычніка бачылі дзяўчынку, якая ішла па набярэжнай разам з нейкім мужчынам. Усіх, хто ў той дзень бачыў дзяўчынку альбо адну, альбо з кім-небудзь, міліцыя просіць патэлефанаваць. Ляна была апранута ў ружовую куртачку і зялёную з белымі ўстаўкамі шапачку. У руцэ магла несці фламастары.

Для вышуку злачынцы створана група з супрацоўнікаў крымінальнага вышуку МУС і ГУУС Мінгарвыканкама. Справа знаходзіцца на кантролі міністра ўнутраных спраў.

СТОЛИЦА

Мэру не понравилась реклама

В течение ближайшего месяца Мингорисполком проведет инвентаризацию всех рекламных щитов, расположенных на столичных улицах. Соответствующее распоряжение дал мэр Минска Михаил Павлов, сообщает агентство "Минск-новости".

Павлов отметил, что реклама должна быть эстетичной и украшать город, а не портить его внешний вид, что как раз и происходит на некоторых улицах. Минску не хватает единой системы рекламного оформления по тематике, форме и местам размещения щитов. В частности, нарекания со стороны мэра вызвал перекресток двух центральных магистралей — проспекта Победителей и улицы Машерова.

В ближайшие дни будет создана рабочая комиссия, в которую войдут главы районных администраций. Ей предстоит оценить состояние рекламного оформления столицы. В декабре будет принято решение, согласно которому городские службы должны будут навести порядок в этом хозяйстве. Кстати, до тех пор в Минске не появится больше ни одного бигборда.

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 ЛІСТАПАДА 2006 г.

КОЛОНКА ЮРИСТА

На вопросы читателей отвечает юрист, руководитель благотворительного фонда «Доброслав» Олег ВОЛЧЕК

Срок — два месяца

На таможне у меня изъяли книги, газеты и брошюры. Я хочу забрать их обратно. Как быть?

С.Волков, г.Брест.

Вам необходимо обратиться с заявлением на имя начальника таможни с просьбой, возвратить изъятое на том основании, что прошло 2 месяца.

На основании п.4.2 Приказа Государственного таможенного комитета Республики Беларусь от 19.12.1994 N 377-ОД "Об утверждении "положения об организации таможенных исследований и экспертиз в таможенных органах Республики Беларусь" и "положения о порядке изъятия проб и образцов вещей для таможенных исследований" по завершении исследования аналитическая проба (образец) возвращается по письменному заявлению владельца.

Алиментов все равно не избежать

С меня определением суда взысканы алименты на содержание сына. В суд меня не вызывали, почему?

А.Яшкевич, г.Минск.

С Вас взысканы алименты на содержание сына определением о судебном приказе. Если Вы не согласны с решением суда, то напишите заявление об отмене судебного приказа на имя судьи, который принял определение. Определение будет отменено, а заявителю будет указано, что можно обращаться в суд с иском о взыскании с Вас алиментов.

Если Вам грозит увольнение

Я работала продавцом в торговом киоске, принадлежащем индивидуальному предпринимателю. Со мной был заключен договор о полной материальной ответственности.

30 сентября мне сообщили о том, что я уволена за нахождение на рабочем месте в состоянии алкогольного опьянения. Я сказала нанимателю, что я трезвая, и попросила его в присутствии нескольких свидетелей отвезти меня в поликлинику и освидетельствовать на наличие алкоголя в крови. Предприниматель отказался. Имеет ли он право уволить меня, как и обещал, за то, что я якобы была пьяная на рабочем месте?

Е.В.Огурцова, г.Брест.

Алкогольное, наркотическое или токсическое опьянение — это особое физическое и психическое состояние. Факт появления на работе в состоянии опьянения должен быть подтвержден медицинским заключением врачей наркологического диспансера или медпункта в организациях. Медицинское освидетельствование проводится по предложению нанимателя в день обнаружения нарушения. Когда наниматель предлагает медицинское освидетельствование, а работник отказывается от него, наниматель вправе составить акт или другой иной документ с подписями свидетелей, в котором отмечается, что нарушение допущено на работе и в рабочее время.

Если Вас уволят на основании нахождения на рабочем месте в нетрезвом состоянии, но найдутся свидетели, которые подтвердят Ваши показания, Вы сможете оспорить данное основание в судебном порядке.

P.S. ***Просьба присылать в редакцию письма с указанием обратного адреса и контактного телефона.***

ПРОБЛЕМА

Беларусь спивается

К такому выводу приходят МВД и Минздрав

"Общее число лиц, находящихся под наблюдением белорусской наркологической службы, достигло рекордной цифры: 265 тысяч человек, **— говорит главный нарколог Минздрава Беларуси Владимир Максимчук. —** *Еще пять лет назад было менее 200 тысяч. Это говорит о росте алкоголизации населения. Надо принимать какие-то меры..."*

Страшные цифры

Начальник управления профилактики милиции общественной безопасности и специальной милиции МВД Беларуси **Николай Дрозд** отмечает, что каждое третье преступление по линии уголовного розыска совершается в состоянии алкогольного опьянения: в минувшем году выявили 21 тысячу пьяных преступников.

В Беларуси более 30 тысяч семей, в которых ссоры и пьяные скандалы стали нормой жизни.

В конце 2005 года насчитывалось свыше 175 тысяч больных алкоголизмом (из них 81 процент — мужчины).

Больше 32 тысяч белорусов имели алкогольные психозы (это почти в два раза превышает цифры пятилетней давности).

Женский алкоголизм вырос с 4 до 26 тысяч.

В Беларуси на душу населения в среднем приходится 9,4 литра алкоголя. Для сравнения: в России, где пьют даже тормозную жидкость, — 9,1, в Польше и Латвии — около 7 литров.

Пьют все, что горит

По словам представителей МВД, денег на дорогие мартини, вина и коньяки хватает далеко не у всех, поэтому подавляющее большинство белорусов пьет *"дешевые плодово-ягодные вина"* и *"некачественный самогон"*.

Что делать?

На этот вопрос заместитель начальника — начальник милиции общественной безопасности и специальной милиции ГУВД Миноблисполкома **Александр Барсуков** отвечает не задумываясь: *"Тех, кто занимается самогоноварением, нужно душить, как тараканов"*.

Милиция регулярно проводит рейды по выявлению подпольного производства горячительного зелья.

"Но если раньше в частных подворьях занимались самогоноварением, то теперь переносят эти заводы в труднодоступную местность, куда даже на "уазике" не доберешься, — только гужевым транспортом, — говорит полковник Барсуков. — *Мы приезжаем, завод уничтожаем на месте. Но через месяц-два эти дельцы начинают работать еще с большим усилием, потому что им надо покрыть свои убытки. Если бы видели, в каких антисанитарных условиях они готовят свою отраву! Один раз показать все это по телевизору — и больше никто бы к рюмке не притронулся!"*

Голь на выдумки хитра

По словам **Александра Барсукова**, фантазии горе-бизнесменов нет предела.

"Доходит до того, что спиртосодержащую жидкость по 8 тонн заливают в днище автомобиля! — рассказывает замначальника ГУВД Миноблисполкома. — *Представляете, какое там качество?! Мы проводим комплекс оперативных мероприятий, какое-то время — полное затишье. А затем эпопея начинается заново. Некоторые умудрялись переправлять самогон в молоковозах и даже обычных бидонах!"*

За самогоноварение полагается немаленький штраф — 30 базовых величин.

"Одну даму штрафовали уже, наверное, раз двадцать! — рассказывает начальник управления профилактики милиции общественной безопасности **Николай Дрозд.** — *Судебные исполнители, когда приходили описывать ее имущество, в доме видели только стол и стул — все остальное уже было описано. Но на самом деле эта "бизнес-вумен" от торговли паленым спиртным имела приличные доходы: в соседнем микрорайоне она имела роскошный коттедж..."*

Напоишь мужа — отравлю корову

"В сельской местности с теми, кто делает бизнес на чужом горе, разбираются по-своему, — говорит **Александр Барсуков**. — *Иногда, если местная власть не реагирует, дело доходит до самосуда. Могут корову отравить или даже дом поджечь. Чтобы до таких крайностей не доходило, мы везде рекламируем горячую линию: 270-55-01. Не можете отвадить мужа от соседа, который владеет подпольным водочным заводом, — звоните нам. Приедем и разберемся.*

Я считаю, что церемониться с теми, кто наживается на детских и женских слезах, ни в коем случае нельзя".

Нетрезвый мент

Не секрет, что отдельные представители правоохранительных органов сами пьют как сапожники.

"За прошлый год мы уволили за управление транспортным средством в состоянии алкогольного опьянения 28 сотрудников милиции, — говорит Барсуков. — Мы в этом плане не выгораживаем своих сотрудников. И я, когда задерживаем пьяницу, кроме чувства удовлетворения, ничего не испытываю. Я к спиртному совершенно равнодушен. Вообще не пью, даже дорогие и качественные напитки. Не нахожу в этом никакого кайфа..."

Тест на алкозависимость

Известно, что каждый, кто претендует на высокую должность, проходит специальную проверку. Министром или его замом становится тот, чью кандидатуру одобряет спецкомиссия при Совбезе. В кулуарах эту процедуру называют тестом на лояльность к действующей власти. Не исключено, что в будущем все ответственные работники будут проходить еще и тест на алкозависимость.

"Сейчас такой тест никто не проходит, — говорит замначальника ГУВД Миноблисполкома. — *Но при поступлении на работу в органы внутренних дел проверяют, привлекался ли ранее человек к уголовной или административной ответственности. Если он задерживался, например, за управление транспортом в нетрезвом состоянии, то на работу в ГАИ его не возьмут. На мой взгляд, если будет введен тест на алкозависимость, то его прохождение должно быть добровольным. Если человеку нечего опасаться, то он его пройдет без проблем".*

Артисты тоже пьют...

"Ни для кого не секрет, что творческие люди иногда склонны к употреблению спиртного, — говорит замминистра культуры **Валерий Гедройць**. — *Но такие "звезды", как правило, на небосклоне долго не задерживаются.* И сейчас я не могу назвать артистов эстрады, которые имели бы проблемы с алкогольной зависимостью".

Кстати, по словам Валерия Карловича, *"после принятия документов об ужесточении дисциплины в стране из сферы культуры было уволено несколько человек, которые имели проблемы с алкоголем".*

Сам Гедройць признает, что, несмотря на обилие рекламы пива, совершенно равнодушен к этому напитку. Под настроение может выпить бокал хорошего вина.

Имидж сформирует Минкульт

Валерий Гедройць убежден, что для решения проблемы алкоголизации населения необходимо сформировать в обществе позитивный образ современного белоруса, а также пропагандировать культуру пития.

"Например, мне в этом смысле очень импонирует Америка, где давно сформировали образ настоящего гражданина, — высказывает свое мнение Гедройць. — *Патриот (возле дома развевается национальный флаг), занимается спортом, удачлив в бизнесе. На мой взгляд, сформировать имидж современного и успешного белоруса — одна из главных задач Министерства культуры".*

Звучит, конечно, красиво.

Но имидж нации формируют не чиновники, а ее лучшие представители. Некоторых из них — бизнесменов, политиков, журналистов, — белорусский режим уничтожил в прямом смысле этого слова.

Теперь пытаются поставить на колени литераторов, создав придворный союз. А народных писателей и поэтов, которые отказались быть прислужниками власти, — вовсе вычеркнуть из памяти и, возможно, даже из школьных учебников.

Существуют "черные" списки запрещенных музыкантов.

"Нячэсных" журналистов лишают места работы и профессии.

А может, БТ снова начнет пиарить "непьющего патриота", "героя нашего времени" **Дмитрия Павличенко?** Если так, то рука к рюмке потянется даже у тех, кто до сих пор воспринимал ее (рюмку) лишь как необходимый атрибут домашнего интерьера...

Марина КОКТЫШ.

Прогноз

Главный нарколог Минздрава Беларуси **Владимир Максимчук** надеется что, *"итогом выполнения государственной программы по борьбе с пьянством и алкоголизмом будет сокращение к 2010 году уровня алкоголизации населения на 3 процента".*

БЛИЦ

А у Вас были проблемы с алкоголем?

Руслан ВАШКЕВИЧ, художник:

— Да, у меня были серьезные проблемы. Не раз возникали неподконтрольные ситуации, которые не удавалось решать одним усилием воли. Уходил в длительные запои. Борьба с алкозависимостью принимала затяжной, оборонительный характер. Сейчас я в очередной раз победил алкоголизм. Но не кодированием, а самостоятельно. Так судьбоносно и принципиально для меня сошлись обстоятельства, что мне нужно было решать: или— или...

Уладзімір АРЛОЎ, пісьменнік:

— Я люблю выпіць келіх, а часам і пляшку чырвонага сухога. Апошнім часам аддаю перавагу чылійскім альбо паўднёва-афрыканскім вінам.

Пра праблемы з алкаголем, калі можна, казаць не буду. Для мяне гэта вельмі балючае пытанне, бо яно кранае маіх блізкіх знаёмых...

Татьяна ОНИЩЕНКО, физик:

— У меня муж пьет. Когда напивается, дело доходит до рукоприкладства, я убегаю из дома. А проспится — золотой человек, цветы дарит и прощения просит. Он не считает себя алкоголиком...

Светлана КАШИЦКАЯ, хозяйка спортивного клуба «Эдем»:

— По дороге на работу не раз замечала, как около местного винно-водочного магазина собирается группа людей синюшного вида. Но это, наверное, далеко не вся Беларусь...

В моей семье, к счастью, проблем с алкоголем нет.

Сама я из всех спиртных напитков предпочитаю белое вино.

Олег САКАДЫНЕЦ, психотерапевт, депутат:

— Я лечу от алкогольной зависимости, сам практически не пью. Этому делу подвержены представители самых разных социальных групп: и врачи, и юристы, и педагоги, и трактористы. Ко мне приходили и совсем молодые люди, и даже те, кому уже за 80 лет.

Диагноз "синдром алкогольной зависимости" можно поставить, если: алкоголь наносит неприятности здоровью, работе, разрушает семью, ухудшает материальное положение человека.

Бывало, люди ко мне приходили босиком — все пропив, они просили помочь. И вылечивались. Алкоголизм, как и многие другие болезни, излечим. Человек просто должен выбрать, что ему важнее: рюмка или семья, уважение, благополучие....

РОЗНЫЯ-РОЎНЫЯ

Чаму многія інваліды апынуліся за рысай беднасці?

Аб неабходнасці перагляду бюджэту пражытачнага мінімуму для інвалідаў з улікам крытэрыяў цяжкасці інваліднасці заявіў на пасяджэнні "круглага стала" ў Мінску намеснік старшыні праўлення Беларускага таварыства інвалідаў Сяргей Драздоўскі.

Паводле яго слоў, згодна з меркаваннем, што бытуе, *"калі на вуліцы няма інваліда ў, якія просяць міласціну, то галечы сярод іх няма"*. У той жа час, як адзначыў С.Драздоўскі, сацыялагічныя даследаванні 2003 года сведчаць аб тым, што ў 40% сем'яў, у якіх жыве інвалід, узровень даходаў быў ніжэйшы за бюджэт пражытачнага мінімуму на чалавека. За рысай беднасці жывуць каля паловы сем'яў, у якіх ёсць інвалід 1-й групы. Акрамя гэтага, паводле слоў С.Драздоўскага, інвалід вельмі абмежаваны ў плане працаўладкавання і вымушаны несці іншыя расходы, звязаныя з кампенсаваннем яго фізічных асаблівасцяў, лячэннем і да т.п.

Згодна з афіцыйнай статыстыкай, у Беларусі сёння жыве больш за 504 тыс. інвалідаў, што складае каля 5,2% ад агульнай колькасці насельніцтва. Паводле звестак Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, у чэрвені 2006 года сярэдні памер пенсіі па інваліднасці складаў 227 тыс. 470 рублёў. У той жа час малады інвалід, які дасягнуў 18 гадоў і не мае працоўнага стажу, атрымлівае сацыяльную пенсію, памер якой крыху большы за 107 тыс. рублёў.

Як заўважыў на пасяджэнні "круглага стала" саветнік прадстаўніка ААН у Беларусі Уладзімір Шчэрбаў, *"у Беларусі няма дакладнай афіцыйнай статыстыкі аб узроўні жыцця інвалідаў"*. Ён выказаў надзею, што Беларусь ратыфікуе міжнародную канвенцыю аб правах інвалідаў, якая павінна быць прынята на бягучай сесіі Генеральнай асамблеі ААН. Канвенцыя, паводле яго слоў, прадугледжвае элемент справаздачнасці аб праведзенай рабоце.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

ДЗІКУНСТВА

Наехаў на інвалідную каляску

Гэта жудасная гісторыя абурыла ўвесь Будслаў. Днямі тут кіроўца аўтамабіля "Жыгулі" здзейсніў наезд на дзвюх састарэлых жанчын, якія вярталіся з касцёла. Адна з іх знаходзілася ў інваліднай калясцы, другая — каціла каляску па ўскрайку праезнай часткі дарогі.

Па словах начальніка Мядзельскай ДАІ Андрэя Чарняўскага, правілаў руху яны не парушалі. Кіроўца ж не толькі кіраваў машынай, не маючы правоў, але і знаходзіўся ў стане моцнага алкагольнагаап'янення.

Са шматлікімі цялеснымі пашкоджаннямі пацярпелыя жанчыны былі дастаўлены ў бальніцу.

Зміцер ПАНЯМОНАЎ.

СІТУАЦЫЯ

Бяда на ўсіх адна

Бальніца

Наваельня — пасёлак у соснах. Яны растуць на вуліцах, у дварах, у агародах. Асабліва гаючае паветра тут вясной і на пачатку лета, калі на дрэвах з'яўляюцца маладыя ігоўлачкі. Невыпадкова пасля вайны на ўскрайку пасёлка адкрыўся рэспубліканскі туберкулёзны санаторый. Тут нават было хірургічнае аддзяленне, дзе высокакваліфікаваныя ўрачы праводзілі аперацыі на лёгкіх.

Санаторый існаваў да мінулага года, а цяпер тут рэспубліканская туберкулёзная бальніца "Наваельня". У ёй далечваюцца людзі, якія да гэтага часу імкнуліся пазбавіцца ад цяжкай хваробы ў іншых установах аховы здароўя. Папраўіўшыся, некаторыя вяртаюцца ў свае сем'і. Я кажу некаторыя, таму што далёка не ва ўсіх гэтыя сем'і ёсць. Крыху ніжэй скажу чаму.

Зараз у бальніцы лечацца 160 хворых. Калектыў медыцынскіх работнікаў, а таксама тэхнічнага і рознага іншага персаналу налічвае 156 чалавек.

Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што ў Беларусі лепш, чым дзе-небудзь на прасторах СНД, наладжана лячэнне хворых на туберкулёз. Яно вельмі дарагое. Да таго ж хворыя атрымліваюць высокакаларыйнае харчаванне, што пры туберкулёзе вельмі неабходна.

У бальніцы "Наваельня" засталіся працаваць тыя людзі, што былі і ў санаторыі. Тут зроблены рамонт. У кожнай палаце, а таксама на калідорах, устаноўлены бактэрыцыдныя апрамяньлнікі, якія ачышчаюць паветра. Ёсць цырульня, бібліятэка, тэлевізары, тэлефоны-аўтаматы, прадаюцца карткі да іх.

Хворыя

Гэта няшчасныя людзі. У многіх з іх да таго ж паламаныя лёсы. Яны ў свой час прайшлі праз турмы, дзе, дарэчы, і нажылі гэтую каварную хваробу. Нямала алкаголікаў, бяздомных. Некаторыя прыкаваны да пасцелі. Тыя, што маюць больш сілы, але таксама з цяжкай формай туберкулёзу, ходзяць па пасёлку — у магазіны, сталовую. І паводзяць сябе не лепшым чынам. Купляюць спіртное і, выпіўшы, спрабуюць нешта даказаць. Яны ў крыўдзе і на лёс, і на хваробу, і на ўсё і ўсіх, што іх акружае. Невыпадкова таму ў корпусе дзяжурыць міліцыя, бо медыцынскія работнікі не могуць даць рады нецвярозым людзям, якія па многа гадоў адсядзелі ў турме за здзейсненыя злачынствы.

Хворыя часта паміраюць. Здараецца, што не ўсіх нябожчыкаў ёсць каму забраць і палюдску пахаваць. Гэты цяжар кладзецца на работнікаў бальніцы. Сёлета яны ўжо пахавалі пяць чалавек. Трэба сказаць, з вялікімі цяжкасцямі, бо грошы для гэтага выдзяляе выканкам мясцовага Савета, адкуль хворы прыехаў у бальніцу. Трэба ехаць туды, атрымаць грошы, потым купіць труну, адзенне...

Хворыя розныя. Адны азлобленыя, другія ў глыбокім адчаі, а хто і абыякавы да ўсяго на свеце. У некаторых ёсць жыллё, але яны не клапоцяцца, каб перадаць яго ў спадчыну каму-небудзь з родных, бо часта не ведаюць, ці жывыя родныя, як склаўся іх лёс. Яны ўжо даўно ні пра каго ні клапоцяцца, як ніхто не клапоціцца пра іх.

Пасёлак у трывозе

Наваельненцы не былі ў захапленні і раней, калі ў пасёлку быў туберкулёзны санаторый: страх перад каварнай хваробай перавышаў усё. Скоса глядзелі на адпачываючых, убачыўшы іх у грамадскіх месцах. Цяпер жа гэты страх узмацніўся, можа, разоў у сто. Ужо пры адным позірку на худых, змардаваных хваробай людзей, на рукі, спрэс у татуіроўках, прывезеных з месцаў не вельмі аддаленых, у жыхароў пасёлка з'яўляюцца невясёлыя думкі. Сустрэўшыся на вуліцы, стараюцца хутчэй размінуцца. Баяцца заразіцца туберкулёзам. Ды і за дзяцей трывожна, бо непадалёку ад бальніцы размешчаны дзіцячы садок, школа.

Адміністрацыя бальніцы просіць хворых не хадзіць у пасёлак. Тым больш што і патрэбы для гэтага няма: на тэрыторыі ёсць магазін, дзе можна купіць як прадукты харчавання, так і прамысловыя вырабы. Але няма і быць не можа спіртнога. За ім і ідуць.

Спрабавалі не пускаць. Закрывалі на замок вароты, спадзеючыся, што хворыя не пералезуць праз даволі высокі плот. Але дзе там! Хто плот ламаў, хто пад ніз падлазіў. Так ці інакш, але запаветная бутэлька дастаўлялася ў бальніцу.

Тых, хто вельмі сур'ёзна парушыць рэжым, накіроўваюць на прымусовае лячэнне. Там высокая агароджа, ахова. Адтуль хворы ўжо не ўцячэ па спіртное. Але ж чалавека проста так туды не пашлеш. Толькі суд мае права прыняць адпаведнае рашэнне.

Каб хворыя не мелі магчымасці хадзіць у пасёлак, і вакол бальніцы хочуць узвесці высокую агароджу, а на прахадной арганізаваць кругласутачнае дзяжурства міліцыянера. Зрабіць што-небудзь іншае адміністрацыя бальніцы не ў сілах.

Алег ДАРАШЭЎСКІ.

Дзятлаўскі раён.

АТЫ-БАТЫ

Адмовіўся ад хабару — атрымаеш прэмію

За падтрыманнем належнага рэжыму ў пунктах пропуску на дзяржаўнай мяжы ажыццяўляецца тайнае назіранне з прымяненнем відэа- і фотатэхнікі для выяўлення неслужбовых кантактаў вайскоўцаў і парушэнняў тэхналагічнай схемы пагранічнага кантролю ў злучэннях і часцях. Пра гэта на прэс-канферэнцыі ў Мінску паведаміў начальнік службы ўласнай бяспекі Дзяржаўнага камітэта пагранічных войскаў Беларусі падпалкоўнік Уладзімір Рыбальчанка.

Апрача таго, па ўзгадненні з камандаваннем злучэнняў і часцей супрацоўнікамі падраздзяленняў службы ўласнай бяспекі Дзяржкампагранвойскаў штомесяц праводзяцца раптоўныя надгляды транспартных сродкаў з пагранічнымі нарадамі, а таксама рэгулярна праводзяцца аператыўныя апытанні вайскоўцаў пасля вяртання іх да месца пастаяннай дыслакацыі.

У.Рыбальчанка паведаміў, што за адмаўленне ад хабару ваеннаслужачаму пагранічных войскаў выплачваецца прэмія ў суме 300 тысяч рублёў. Разам з заахвочваннем асабовага саставу, зазначыў У.Рыбальчанка, "у мэтах папярэджання ўзнікнення і разбурэння наяўных супрацьпраўных сувязяў паміж службовымі асобамі пагранвойскаў і іншых кантрольных служб у пунктах пропуску па прадстаўленням службы ўласнай бяспекі Дзяржкампагранвойскаў праводзіцца планавая ратацыя кантралёрскага складу ў межах падраздзяленняў". Аператыўны састаў і афіцэры аддзяленняў пагранкантролю праходзяць службу ў адным аддзяленні не больш за тры гады.

У выніку дзейнасці службы, узначальваемай У.Рыбальчанкам, праваахоўнымі органамі сёлета распачаты 34 крымінальныя справы па лініі барацьбы з карупцыяй, 26 чалавек звольнены з пагранвойскаў.

Генадзь ШАРЫПКІН.

НАКАНУНЕ

Поговорят о многополярности

Александр Лукашенко встречается с лидерами, к которым у цивилизованного мира серьезные претензии, связанные прежде всего с демократическими свободами граждан. Он слетал на Кубу, принял у себя лидера Венесуэлы, а теперь вот визит в Иран.

По мнению главы иранского государства, у Беларуси и Ирана сходные позиции по ключевым вопросам международной политики. Судя по всему, главное, что объединяет две страны, это приверженность многополярному мироустройству и неприятие доминирования США в мировой политике. Ахмадинежад подчеркнул, что все страны, стремящиеся к тому, чтобы миропорядок изменился, должны сотрудничать.

Чтобы преобразовать однополярную систему в многополярную, Беларусь готова сотрудничать с Ираном. Такую мысль высказал и министр иностранных дел Беларуси Сергей Мартынов на встрече с президентом Ирана Махмудом Ахмадинежадом. *"Беларусь готова сотрудничать с Ираном и другими независимыми странами, чтобы преобразовать однополярную систему в многополярную"*, — сказал он.

Другое дело, сможет ли такая маленькая страна, как Беларусь, существенно повлиять на расстановку мировых политических сил. Скорее это исходит из заоблачных мечтаний и предназначено лишь для местного электората. Известно, что Лукашенко, руководителей Кубы Кастро и Ирана Ахмадинежада не балуют своим вниманием лидеры ведущих стран. Для Лукашенко закрыт путь в Европу и США. Поэтому ничего не остается, как встречаться между собой. А чтобы придать этим встречам важность, решили побороться за многополярность.

Сергей ИВАНОВ.

ДИКТАТУРА

Что на обед «дорогому председателю»?

Являются ли предметами роскоши бигмаки и суп из акульих плавников? А фильмы про Джеймса Бонда? Или запеченное мясо осла? Такого рода вопросы придется решать Совету Безопасности ООН, когда он будет определяться с характером санкций, вводимых против Северной Кореи и ее своеобразного лидера Ким Чен Ира в качестве реакции на проведенные ядерные испытания. Эту тему поднимает влиятельная газета **"Financial Times"**.

